# Аб прычынах

Часта любяць людзі пытацца: „Чаму?“ „Чаму, скажам, у Слуцку ёсьць „Яешны склад“, а ў Менску няма?“ Быццам, калі чалавеку сказаць „чаму“, дык ужо і ўсё — далей і болей нельга мысьліць. Або яшчэ нібы на гэтым „чаму“ ўсё і дзержыцца. Але–ж і так. Можна–ж пытацца „чаму“ без канца, і выйдзе, што яго не знайсьці. Значыць, можа быць, зусім справа ня ў гэтых „чаму“. Можа, ніякіх прычынаў і няма. Бо–ж калі разлажыць у рад прычыны і дзейнасьці, то адно адначасна будзе і прыч[ынай], і дзейн[асьцю] (пасьледкам). Выходзіць, што калі тлумачыць адно дзеяньне якім другім, — гэта знача нічога не тлумачыць. Тут толькі апавядаюцца тыя ці іншыя здарэньні ў пэўнай кампаноўцы, якая зьяўляецца сама па сабе толькі выяўленьнем душы таго, хто так расказвае. І сапраўды, на чым грунтуецца (даруйце мне гэтае слова, людзі так прывыклі ўсё грунтаваць, што бяз „грунтаў“ і кроку ніхто ня можа ступіць) людзкое разуменьне прычын[н]ай залежнасьці? На часе. Адно дзеяньне адбываецца пасьля другога якога. Вось толькі–ж на падставе гэтага чалавек пачаў мысьліць аб прычынных залежнасьцях. А як адкінуць час, дык рушыцца прычыннасьць. Сьвет–жа не абмяжоўваецца існаваньнем толькі аднэй–жа пары. Для нас, скажам, ёсьць час, а для ўсяго сусьвету? Вядома, паколькі мы прызнаём за аснову (зноў грунт), скажам, матэрыю, для якой прычын няма, а знача няма і прошлага часу, дзе–ж няма прошлага, ня можа быць і будучага, застаецца толькі цяперашні, пастолькі для ўсяго сусьвету няма часу. (Час складаецца з трох момантаў — прошлы, цяперашні, будучы. Адсутнасьць хоць аднаго з гэтых момантаў робіць час ужо ня часам.) Так, прычыннасьці няма, як і часу. Няма–ж прычыннай залежнасьці. Знача, няма пасьледкаў і мэтаў [апошнія раўназначны ці раўнаважныя, бо мэта ёсьць нішто іншае, як уяўленьне якога–небудзь дзеяньня, якое павінна стацца пасьледкам папярэдніх дзеяньняў (пэўных прычын)]. Ёсьць толькі рух, і то толькі для нашага разуменьня. Магчыма, што для ўсяго сусьвету ў цэлым гэты рух ёсьць статыка. Мы, скажам, круцімся, а ў цэлым увесь сьвет? Мо’ ён толькі стаіць? (Вазьмеце кулю, якая так хутка круціцца вакол свае восі, што вам здаецца яна стаячаю ў стане [с]пакою, калі глядзіце на яе. Калі–ж мацняце рукою, то вам здацца яна толькі страшэнна гарачаю і толькі і вы можаце не заўважыць руху. Цяпер уявеце сябе ў стане гэтай кулі ў абсалютнай адмяжованасьці ад усяго, к чаму можна было–б прыраўноўвацца. У першым выпадку была куля і былі вы, а [ў] другім толькі вы ў ролі кулі і... больш нікога і нічога. Вы ня будзеце знаць, што вы круціцеся. Магчыма, што вы мысьлілі–б, што знаходзіцеся ў стане абсалютнага [с]пакою.) Ёсьць адно толькі „ёсьць“. Чалавек гэтае „ёсьць“ раскладае на часткі, прыводзіць да парадку, устанаўляе сыстэмы і г. д. А тады ўжо ўяўляе сабе цэлае ў пэўнай кампаноўцы ўспрынятых частак. Так што разуменьне аб прычыннай залежнасьці ў зьявах ёсьць ні больш ні мен[ш] як адным з людзкіх спосабаў кампаноўкі ўспрынятага. (Адгэтуль магчымасьць **апавядаць** пра прычынна–залежныя здарэньні ў другой кампаноўцы.)

*[1933]*